УДК 94(476-15)«1921»:314

**Анатоль ТРАФІМЧЫК**

*Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX і XXI стст. Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук.*

*Аўтар больш за 300 навуковых і навукова-папулярных публікацый па гісторыі Беларусі і літаратуразнаўстве ў айчынных і замежных выданнях. Аўтар шэрагу паэтычных, публіцыстычных і навуковых кніг, у тым ліку "Пасведчанне аб нараджэнні" (Мінск, 1999), "Якуб Колас — вядомы і невядомы" (Мінск, 2012), "Беларуская дзіцячая драматургія" (Мінск, 2012), "Колас зямлі беларускай" (Мінск, 2017), "Гісторыя Круговіцкае школы. Сшытак 1: У часы Расійскай імперыі" (Масква, 2019), "Мастацка-вобразны рэалізм паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" (Мінск, 2023) і інш.*



# Вынікі перапісу 1921 г. у Заходняй Беларусі: *мікрагістарычнае даследаванне на прыкладзе Круговіцкай гміны Лунінецкага павета Палескага ваяводства*

**У выніку перапісу 1921 г. беларусамі ў міжваеннай Польскай Рэспубліцы былі пазначаны трохі больш чым адзін мільён чалавек — менш за трэць ад усяго насельніцтва тэрыторыі, называнай (толькі не палякамі) Заходняй Беларуссю (без Віленшчыны, якую неўзабаве Польшча адбярэ ў Літвы). Сама больш, натуральна, налічылі палякаў — ажно пад два мільёны, якіх на паперы аказалася абсалютная большасць. Астатнія этнічныя групы складалі яўрэі, рускія, літоўцы і інш. У чым выявілася спецыфіка перапісу 1921 г.? Што адметнага зафіксавана па Круговіцкай гміне?**

**Ключавыя словы**: *Заходняя Беларусь, Круговіцкая гміна, населеныя пункты, перапіс, нацыянальны склад, канфесійны склад*

## *Уводзіны*

У 1921 г. польска-савецкая вайна закончылася не толькі фактычна, але і юрыдычна. Згодна з Рыжскім мірным дагаворам беларускія землі на захад ад Мінска (у тым ліку Круговіцкая гміна) апынуліся ў складзе Польскай Рэспублікі. Між тым за час вайны дзяржаўны курс Варшавы прынцыпова змяніўся: федэралісцкую канцэпцыю Ю.Пілсудскага пераважыла інкарпарацыйная, ідэйным лідарам якой быў Раман Дмоўскі. Інкарпарацыйны праект прадугледжваў пабудову дзяржавы на аснове этнічна польскай тэрыторыі з уключэннем тых зямель, на якой палякі, не пераважаючы колькасна, дамінавалі ў культурным жыцці. У такім разе карэктаваліся падыходы да ажыццяўлення ва ўсходніх рэгіёнах, так званых Крэсах, адпаведнай палітыкі: неабходна было рознымі сродкамі мінімізаваць існаванне нацыянальных меншасцяў і тым самым павялічыць складнік тытульнай нацыі.

З гэтай нагоды польскае кіраўніцтва вырашыла правесці чарговы перапіс насельніцтва. Першы ўлік насельніцтва і яго нацыянальнага складу на "Крэсах Усходніх" ажыццёўлены ў 1919 г. Агульныя вынікі былі наступныя: беларусамі (з улікам "тутэйшых") зафіксавана блізу паловы ад усяго насельніцтва [1]. Але праз два гады перад уладай паўстала задача абгрунтаваць уваходжанне ўсходніх зямель у склад Польскай Рэспублікі. Таму тэндэнцыйнасць у правядзенні перапісу закладвалася адпачаткова. Менавіта разгляд вынікаў перапісу 1921 г. праз мікрагістарычную прызму дазваляе ўстанавіць яшчэ адзін шлях паланізацыі беларускіх зямель. Яго выяўленне (па матэрыялах пэўнай мясцовасці) і ставіцца на мэце ў гэтым артыкуле на прыкладзе Круговіцкай гміны. Гэтая адміністрацыйная адзінка ўвабрала рысы як палескага рэгіёна, так і тэрыторый на поўнач ад яго, да таго ж пэўны адбітак накладаўся па прычыне блізкасці да дзяржаўнай мяжы з БССР.

## *Агульныя вынікі перапісу 1921 г. па Заходняй Беларусі*

У выніку перапісу 1921 г. суадносіны нацыянальных меншасцяў і палякаў істотна змяніліся на карысць апошніх. Нават Навагрудскае ваяводства (за выключэннем паветаў, што неўзабаве ўвайшлі ў Віленскае ваяводства), дзе беларусы перад гэтым выявілі дастаткова сталую свядомасць, аказалася нібыта больш чым на палову спаланізаванымі пры невысокім паказчыку беларусаў (напрыклад, па Лідскім павеце толькі 13,1%) [2, s. 59].

Пераважная колькасць беларусаў задакументаваная на Палессі. Але і яны не перавышаюць паловы — 42,6% ад усіх 880,1 тыс. жыхароў ваяводства. Пры гэтым перапісчыкі налічылі 24,3% палякаў і 10,4% яўрэяў; акрамя іх шмат было рускіх (17,7%) [3, s. X—XI]. У той жа час канфесійны склад насельніцтва даваў падставу для істотных паправак нацыянальнага складу. Таму нават сучасныя польскія даследчыкі прызнаюць атрыманую лічбу беларусаў моцна заніжанай [2, s. 59—61].

Аб'ектыўная статыстыка павінна была дэманстраваць іншыя паказчыкі адносна беларусаў. Польскі даследчык П.Эбэрхардт лакалізаваў сваё даследаванне толькі тэрыторыяй сучаснай Беларусі, якая тады апынулася "пад Польшчай". Ён падлічыў, што ў палякі запісаліся больш чым 300 тыс. асоб не рымска-каталіцкага веравызнання. У той жа час з 2,2 млн жыхароў усходніх паветаў Польшчы запісана было палякамі больш чым 1 млн пры 692,9 тыс. вернікаў рымска-каталіцкага касцёла. Затое праваслаўных было ледзь не ў два разы больш — не менш чым 1,3 млн чалавек. Значыць, прыходзіць да высновы даследчык, каля 280 тыс. праваслаўных былі запісаныя палякамі. П.Эбэрхардт падае вынік сваіх калькуляцый па паўночна-ўсходніх паветах тагачаснай Польшчы: беларусаў — каля 1350 тыс. (61,4%), палякаў — не менш чым 0,6 млн (27,3%), прыблізна 240 тыс. яўрэяў (11,0%) [2, s. 59—63]. Беларускія даследчыкі павялічвалі долю беларусаў — да 2372 тыс. чалавек (што, праўда, больш шырокай лакалізацыі, чым у П.Эбэрхардта, з ахопам этнічнай беларускай тэрыторыі) [4, с. 103].

Звужаючы фокус нашага даследавання да Лунінецкага павета, прасочым рост колькасці беларусаў паводле афіцыйных дадзеных. З больш чым 81 тыс. жыхароў павета беларусамі запісаныя 57,8 тыс. (71,3%), палякамі — 14,9 тыс. (18,4%), яўрэямі — 5,9 тыс. (7,3%). Канфесійная дыферэнцыяцыя ізноў жа выдае перакос да змяншэння нацыянальных меншасцяў. Так, праваслаўнымі значацца 67,8 тыс. (83,6%), католікамі — 6,4 тыс. (7,9%), іўдзеямі — 6,6 тыс. (8,2%) [3, s. 34—39]. Як бачым, частка праваслаўных і нават іўдзеяў Лунінецкага павета таксама ўвайшла ў лічбу палякаў.

Адметна, што колькасць іўдзеяў тут нават крыху перавышала лічбу католікаў. З улікам наяўнасці сярод католікаў прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці можна зрабіць выснову, што палякі ў Лунінецкім павеце займалі толькі трэцяе месца пасля беларусаў і яўрэяў. Разам з тым варта адзначыць, што пры захаванні агульнага трэнда — гіпербалізацыі польскай прысутнасці пры змяншэнні прапорцый нацыянальных меншасцяў (нават яўрэяў, якіх зрабілі палякамі пры захаванні іх рэлігіі) — Лунінецкі павет пацярпеў у меншай ступені. Гэта, з аднаго боку, павінна было б даць падставы меркаваць пра параўнаўча трывалую нацыянальную свядомасць тых жа беларусаў гэтай адміністрацыйнай адзінкі. Але, з другога боку, далейшыя палітычныя працэсы (у прыватнасці, выбары, арганізацыя ячэек Беларускай сялянска-работніцкай грамады, разнастайныя факты барацьбы за свае нацыянальныя правы і г. д.) не дазваляюць сфармуляваць такую выснову. Таму пакуль даволі высокія — не толькі для Палесся, але і для ўсёй Заходняй Беларусі — паказчыкі долі беларускага насельніцтва Лунінецкага павета застаюцца неразгаданымі.

П.Эбэрхардт палічыў, што людзі самі запісваліся да пэўнай нацыянальнасці, выбіраючы нярэдка польскую — або несвядома (блытаючы яе з грамадзянствам), або, наадварот, свядома (дэкларуючы тым самым лаяльнасць да ўлады і спадзеючыся на прэферэнцыі) [2, s. 61]. Аднак наш далейшы аналіз дэманструе дамінаванне перадусім у ініцыятыве нацыянальнай ідэнтыфікацыі перапісчыкаў.

*Праўленне Круговіцкай гміны. 1934 г.*



## *Агульныя вынікі перапісу па Круговіцкай гміне*

Па некаторых тэрыторыях лічбы перапісу 1921 г. дэманстравалі пераважную колькасць беларусаў. Пры гэтым мікрагістарычны аналіз статыстыкі даў падставы для дадатковых роздумаў па пытанні нацыянальнага складу і яго рэвізіі па Круговіцкай гміне. Усіх жыхароў гміны ў 1921 г. налічылі 13 474 чалавекі. З іх былі запісаныя:

- беларусамі 9308 чалавек — 69,1%,
- палякамі 3776 — 28%,
- яўрэямі 336 — 2,5%.

Прадстаўнікі яшчэ некалькіх нацыянальнасцяў, за выключэннем трох дзясяткаў “rosjan” (рускіх) і 19 аўтахтонаў, прыведзены на ўзроўні статыстычнай пагрэшнасці.




*Дыяграма “Нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва Круговіцкай гміны паводле перапісаў 1919 і 1921 гг.”.*

*Дзеці Палескага ваяводства. 1935 г.*






*Жыхары Круговіцкай гміны. 1930-я гг.*

Якая статыстыка па Круговіцкай гміне па веравызнанні? Насельніцтва ў асноўным складалася з праваслаўных: да іх належала 11 048 чалавек — 82,0%. Толькі 1827 жыхароў гміны былі католікамі — 13,6%. Іўдзеямі пазначаныя 592 чалавекі (485 з іх жылі ў мястэчку) — 4,4%

Прыведзеная дыяграма ілюструе выяўленыя супярэчнасці па Круговіцкай гміне. Так, праваслаўных атрымліваецца на 12,9% больш, чым зафіксавана беларусаў. Іўдзеяў таксама больш на 1,9%. Затое католікаў больш на 14,4%, чым зарэгістравана палякаў. Таксама бачым, што колькасць беларусаў і нават яўрэяў у параўнанні з перапісам 1919 г. за два гады зменшылася. Пры гэтым, звернем увагу, канфесійныя паказчыкі (іх фальсіфікаваць было б складаней) розняцца нязначна, прапорцыі засталіся вельмі блізкімі. Гэта сведчыць пра тое, што рэлігійная сітуацыя ў мясцовасці практычна не змянілася. Невялікае змяншэнне долі іўдзеяў і праваслаўных магло быць выклікана найперш узрастаннем долі католікаў, прысланых для ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі. У той жа час лічбы беларусаў і яўрэяў зменшыліся нашмат больш у параўнанні з палякамі.

У чым прычыны такой трансфармацыі? Натуральна, новая ўлада засяляла беларускія тэрыторыі сваімі прадстаўнікамі — чыноўнікамі і паліцыяй (у выпадку Круговіцкай гміны яшчэ і ахоўнікамі мяжы). Гэта і прывяло да павышэння працэнту католікаў на 1,7% у параўнанні з 1919 г. Аднак сумніўна, што за два гады рэзка ўзраслі прапорцыі на карысць польскай ідэнтыфікацыі. Відавочна, што многія яўрэі, як і этнічныя беларусы, былі залічаны палякамі. Тых, хто спавядае іўдаізм, было прыкметна больш, чым адлюстраваў перапіс 1921 г. Значыць, яго статыстыка зняпраўджана не на карысць яўрэяў. Змяншэння колькасці беларусаў сярод праваслаўных — на 13,3% — таксама быць не магло. Масавай эміграцыі ці ўцёкаў (як, напрыклад, у 1915 г., калі на ўсход ад германскіх акупантаў падалося пераважна праваслаўнае насельніцтва) тады не адбылося, бо фронт спыніўся да Круговіцкай воласці.

Калі ўмоўна прыбраць такія супярэчнасці праз залічэнне ўсіх праваслаўных да беларусаў, іўдзеяў — да яўрэяў, а таксама адняць ад польскага сегмента католікаў, якія не былі палічаны як палякі, дык доля апошніх наогул сыдзе на паказчык, меншы за долю католікаў, — амаль на паўпрацэнта. Не менш чым 1,5 тыс. чалавек (у асноўным беларусаў і невялікая колькасць яўрэяў) былі аднесеныя да палякаў, але імі не з'яўляліся. Паводле перапісу (*гл. с. 44*), католікаў больш, чым палякаў, аказалася ў 13 населеных пунктах з 72 (вёскі Бор, Гута, Красынічы, Кругліца, Нача, Вялікія Круговічы, Жадавічы, фальваркі Круговічы, Любашаў, Нача, Агарэвічы, Падбалоцце, асада Масты), у якіх 79 чалавек няпольскай нацыянальнасці аднеслі да каталіцкага веравызнання. Несумненна, выпадкі неаднясення да палякаў сярод католікаў здараліся і ў іншых населеных пунктах, але падобнага па табліцы не прасачыць. Таму варта лічыць, што сапраўды польская ідэнтыфікацыя сярод жыхароў Круговіцкай гміны знаходзілася ў межах не больш чым 13%. Прычым і гэтая лічба ў многім была дэтэрмінаваная спадчыннасцю і не карэлявала з генетычна-нацыянальным аспектам.

Такім чынам, згодна з перапісам 1921 г. колькасць беларусаў меншая, чым праваслаўных, зразумела, на карысць польскай нацыянальнасці. Гэта відавочная і паўсюдная рыса перапісу таго года — лічбы пад інтарэсы дзяржавы. П.Эбэргарт лічыць, што само насельніцтва магло спрыяць такім хібам ці то з прычыны дэманстрацыі прыязнасці да новай улады, ці то з прычыны атаясамлення сваёй нацыянальнасці з дзяржаўнай прыналежнасцю — грамадзянствам [2, s. 61]. Тым не менш варта адзначыць, што, нягледзячы на паланізатарскую палітыку, жыхары Круговіцкай гміны тады праявілі даволі ўстойлівую нацыянальную і канфесійную свядомасць у адрозненне ад насельніцтва многіх рэгіёнаў Палесся, дзе ў жыхароў адставаў працэс фарміравання саматоеснасці і яны сябе называлі "тутэйшымі" (у перакладзе на свой дыялект) або, што хутчэй, іх запісвалі такімі, бо за два гады перад гэтым перапісам такой масавасці не назіралася.

## *Вынікі перапісу па некаторых паселішчах Круговіцкай гміны*

Сутнасць перапісу 1921 г. выяўляецца праз аналіз дадзеных па асобных населеных пунктах гміны. Разгляд ідэнтыфікацыі насельніцтва па вёсках і мястэчку падвяргае сумненням разважанні П.Эбэргардта (у прыватнасці, асабліва і не аргументаваныя выбаркай выпадкаў, дастатковай для агульных высноў пра асабістую ініцыятыву насельніцтва да самавызначэння, таму прыведзенае вышэй меркаванне даследчыка мае, хутчэй за ўсё, гіпатэтычны характар). Далейшыя прыклады — таму яскравы доказ.

Так, фактычна з'яўляючыся гарадскім паселішчам з насельніцтвам больш чым 1 тыс. чалавек, Ганцавічы ў азначаным плане асабліва паказальныя. Пры мінімуме прадстаўнікоў мясцовай нацыянальнасці (2,7%), які толькі мог быць у беларускім асяроддзі, праваслаўных было зарэгістравана ў 6,5 раза больш (17,5%). Нават з улікам пазначаных іншымі (але славянскімі) нацыянальнасцямі (такіх у Ганцавічах знайшлося няпоўныя

*План Круговіцкай гміны міжваеннага перыяду.*




*Дыяграма "Нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва мястэчка Ганцавічы паводле перапісу 1921 г. (у %)".*






*План існуючага драўлянага двухпавярховага будынка спадара Арона Ліса ў мястэчку Ганцавічы Лунінецкага павета Круговіцкай гміны, прызначаны для размяшчэння ізраільскай сінагогі, 1926. Друкуецца ўпершыню.*
*Крыніца: Archiwum Akt Nowych. — Zespół "Ministerstwo Spraw Wewnętrznych w Warszawie". Sygnatura 2/9/0/5.5/I 2595.*

два дзясяткі) працэнт вырасце да 4,5 і нязначна наблізіцца да прапорцыі праваслаўнага насельніцтва. У два разы розняцца лічбы яўрэяў (23,2%) і носьбітаў іх рэлігіі (47,8%). Хаця ў абодвух выпадках на акрэсленай мясцовасці праваслаўнымі маглі быць у асноўным беларусы, іўдзеямі толькі яўрэі. Між тым лічба палякаў перавышала наяўнасць католікаў больш чым у два разы. Пры гэтым якраз каталіцтва маглі спавядаць і мясцовыя беларусы.

Відавочна, што палякі ў Ганцавічах складалі ў лепшым выпадку трэцюю частку насельніцтва — іх павінна было быць адназначна менш, чым католікаў (хаця да мясцовых палякаў, якія часта лічылі сябе такімі, з'яўляючыся этнічнымі беларусамі, далучыліся прыезджыя для выканання адміністрацыйнай работы ці дзеля аховы правапарадку). Але для рэпрэзентатыўнасці колькасць намінальных палякаў завышаная. Зроблена гэта і за кошт католікаў няпольскай нацыянальнасці, і за кошт праваслаўных, і нават іўдзеяў. Апошняе выглядае наогул свавольствам улады. Яўрэі жылі ў тыя часы даволі "закансерваванымі" суполкамі і трымаліся не толькі рэлігіі, але і нацыянальнай прыналежнасці. Між тым якраз на іх у Ганцавічах прыпала большая частка падтасоўванняў статыстыкі, бо іўдзеі там складалі да паловы насельніцтва і неўзабаве іх стала больш чым палова жыхароў мястэчка. Прыгадаем факт узвядзення дзвюх сінагог (магчыма, то былі толькі малітоўныя дамы) у пачатку міжваеннага перыяду і яшчэ дзвюх, узведзеных за гэты час. З беларусамі, якія ў гістарычным вымярэнні зусім нядаўна сябе адчулі як нацыя, абысціся было, несумненна, прасцей. Але і тут назіраецца непрыхаваная фальсіфікацыя.

Што датычыцца цэнтра Круговіцкай гміны, дык у гэтай вёсцы беларусамі былі запісаныя 645 чалавек — 96,7%. Нязначная доля прыпадала на палякаў (14 чалавек — 2,1%) і яўрэяў (4 — 0,6%). Яшчэ столькі (4 чалавекі) былі аднесеныя да іншай, не ўказанай у крыніцы нацыянальнасці. Большасць кругаўцоў нале-

*Дыяграма "Нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва в. Вялікія Круговічы, аднайменнага фальварка і в. Малыя Круговічы паводле перапісу 1921 г. (у %)".*



жала да праваслаўнай канфесіі — 623 чалавекі (93,4%), да каталіцкай — 39 (5,8%), пражывалі таксама чатыры іўдзеі і адзін евангеліст. Як бачым, у Вялікіх Круговічах некаторыя католікі таксама былі аднесеныя да беларускай нацыянальнасці — з 39 чалавек такіх было 25. У працэнтных суадносінах — 64,1%, што аб'ектыўна нямала. Таму палякаў аказалася менш, чым католікаў. У той жа час колькасць іўдзеяў і яўрэяў, як і належыць, супала.

У цэнтры гміны знаходзіўся фальварак памешчыка Напалеона Абуховіча. Памешчыцкі род вызнаваў сябе за палякаў. Такіх у круговіцкім фальварку налічвалася 9 чалавек (34,6%). Думаецца, яны і складалі сям'ю Абуховічаў. Апрача іх пры маёнтку жылі (хутчэй у якасці абслугі) 17 беларусаў (65,4%). Пры гэтым католікаў там было 14 (53,8%) і, адпаведна, астатнія — 12 чалавек (46,2%) — былі праваслаўнымі. Ізноў-такі бачым, што пяць беларусаў вызнавалі каталіцызм. Таму нават па фальварку католіка-паляка лічбы статыстыкі будуць больш правільнымі, чым па некаторых вёсках гміны.

Цікавы аб'ект паводле перапісу 1921 г. уяўляла в. Малыя Круговічы. Генезіс яе жыхароў, па нашым меркаванні, узыходзіць да этнічнай польскасці. Па-першае, вёска спярша называлася Ляхавічамі. Па-другое, многія роды па сённяшні дзень называюцца па-мясцоваму Мазуровымі, хаця даўно страцілі памяць пра сваяцкія сувязі і носяць (гэта можа быць яшчэ адным аргументам) прозвішчы, блізкія да польскіх тыпажоў [5]. У адпаведнасці з перапісам 1921 г. у Малых Круговічах 489 чалавек (90,1%) лічылі сябе беларусамі, 45 — палякамі (8,3%), 8 — яўрэямі (1,5%). З іх 490 спавядала праваслаўе (90,2%), 45 (8,3%) — каталіцызм і 8 іўдаізм (1,5%). У дадзеным выпадку нацыянальнасці і канфесіі практычна цалкам супалі.

Вартыя ўвагі феномены некаторых іншых вёсак, дзе пры праваслаўным веравызнанні значна пераважылі, паводле перапісу, палякі па нацыянальнасці. Так, на 100% польскім паселішчам пазначаны Кукоў з яго 631 жыхаром, з якіх 564 былі праваслаўнымі (89,4%). Прычым у сэнсе субкультуры кукоўцы нічым не адрозніваліся ад кругаўцоў ці агароўцаў (у Агарэвічах доля беларусаў пераўзыходзіла 90%).

Недалёка ад Кукова "адстала" цалкам праваслаўная Будча, што месцілася на ўсходнім ускрайку гміны і мела некаторыя дробныя, але заўважныя адрозненні ад вёсак яе заходняй часткі. Апошнія схіляліся да гістарычнай Клеччыны, Будча — да Случчыны. У гэтай вёсцы нібыта палякаў аказалася 899 жыхароў (93,9%) супраць 58 беларусаў (6,1%). Мяркуючы па ўсім, значную ролю адыгралі не субкультурныя фактары, але нешта іншае, напрыклад тэндэнцыйнасць перапісчыка.

Не выключаны і чыннік мясцовага, унутрывясковага характару, калі людзі маглі не надаць адпаведнага значэння пытанню аб нацыянальнасці або паблытаць яго з грамадзянствам. Бо суседнія з Будчай і ёй культурна блізкія вялікія вёскі Лактышы, Дзяніскавічы і Еськавічы адпаведна з 99,%, 95,7% і 98,% праваслаўных аказаліся на 99,5%, 95,3% і 98,0% беларускімі. Католікаў



*Настаўнік школы ў в. Будча Адам Гіль.1950-я гг.*

і палякаў у іх было вобмаль. На выніку не ўплывала наяўнасць праваслаўнага храма: яго не было ў Кукове, але меўся ў Будчы, самай аддаленай вёсцы і ад цэнтра гміны, і ад мястэчка. Меншыя, але падобныя з Куковам і Будчай неадпаведнасці датычацца таксама такіх населеных пунктаў Круговіцкай гміны, як Любашаў, Перадзелы, Сукачы ды шэрагу больш дробных.

Адметна, што менавіта ў Будчанскай школе працаваў настаўнік Адам Гіль, які паходзіў з этнічнай беларускай зямлі з-пад Навагрудка, што было ўжо само па сабе рэдкасцю, і больш за тое — у анкетах ён запісаны беларусам. Акрамя Будчы і Вялікіх Круговічаў цэрквы меліся ў Лактышах, Дзяніскавічах, Ізбійскім Бары, Агарэвічах, Начы і Гуце (у апошняй капліца). Касцёлы — толькі адзін у Ганцавічах, і ў Вялікіх Круговічах маленькая капліца. У Ясянцы пры каталіцкіх могілках стаяла капліца (мясцовыя называлі яе "касцёлак" [10]). Яшчэ адзін касцёл быў узведзены напярэдадні Другой сусветнай вайны пры корпусе аховы пагранічча "Людвікова" [11].

Атрымліваецца, што зафіксаваная ў дадзеных 1921 г. нацыянальная рознасць паміж вёскамі аднароднага асяроддзя сведчыць хутчэй не пра рэальны стан рэчаў, а пра маніпуляцыі. Ускоснае, але паказальнае сведчанне такому меркаванню знаходзіцца




*Адбітак фота ў газеце міжваеннага часу касцёла ў Людвікове. Крыніца: Kościół, zbudowany przez żołnierzy KOP w Ludwikowie // Wiarus. — 1939. — Nr. 8, 19 lut. — S. 268.*

пазней, у 1930-я гг., калі ў гміннай дакументацыі некаторыя асобы (што важна — жыхары розных, аддаленых вёсак) былі пазначаныя “палякамі-палешукамі” [12, арк. 13, 87а, 14, 51, 66, 74, 101, 106, 121, 137, 140, 148, 150, 152], хаця іншыя запісаны палякамі. Па почырку не складана ўстанавіць, што гэта зрабіў адзін чалавек. Значыць, і пад час перапісу 1921 г. перакос на карысць польскай нацыянальнасці жыхароў некаторых паселішчаў Круговіцкай гміны быў дапушчаны канкрэтным перапісчыкам.

## Высновы

Пэўная ступень аб’ектыўнасці на пачатку польскага панавання адбілася і на вызначэнні нацыянальнай ідэнтыфікацыі заходнебеларускага насельніцтва. Тым не менш у перапісе 1921 г. паланізатарскі ўхіл прыкметна ўзрос у параўнанні з дадзенымі 1919 г. Колькасць палякаў была павялічана за кошт яўрэяў і беларусаў. Значную частку нацыянальных меншасцяў яшчэ не далучылі да тытульнага народа, але рух да такой трансфармацыі абазначыўся.

Па Круговіцкай гміне прапорцыі нацыянальнага складу аказаліся адпаведныя агульным па Заходняй Беларусі тэндэнцыям: доля насельніцтва польскай нацыянальнасці перабольшана, нягледзячы на тое, што працэнт католікаў быў прыкметна меншы. Па даследуемай тэрыторыі так сталася, напрыклад, за кошт асобных вёсак, такіх як Будча і Кукоў, дзе ў палякі было запісана практычна ўсё насельніцтва! У асноўным атрымаліся вынікі, блізкія да рэчаіснасці, — пераважная большасць жыхароў выяўляла беларускую прыналежнасць. Напрыклад, у цэнтры гміны суадносіны зафіксаваныя з большай адпаведнасцю: да беларусаў былі аднесеныя нават католікі (што не заўсёды бачна ў іншых населеных пунктах і ў цэлым па Заходняй Беларусі). Таму можна лічыць, што тыя тэндэнцыі дзяржаўнай палітыкі ў Круговіцкай гміне рэалізоўваліся ў меншай ступені.

Праз даследаванне паводле перапісу 1921 г. пэўнага мікрарэгіёна выяўляецца, што павелічэнне паказчыкаў польскай нацыянальнасці адбывалася ў кожным паселішчы паасобку, цэнтралізаванасці тут не назіраецца. Адметна, што праз мікрагістарычны падыход выяўляецца стракатасць ідэнтыфікацыі жыхароў розных вёсак. Яны пры адсутнасці прынцыповых адрозненняў у культуры і саматоеснасці ў нацыянальным аспекце былі пазначаныя па-рознаму. Аднак няма сумненняў, што ў тых асяродках пераважала беларускасць.

1. Spis Ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (Grudzien 1919): Z mapą / Eugeniusz Romer. — Lwów : Zarzad Ziem Wschodnich ; Warszawa, Książnica polska T-wa naucz. szkoł wyższych, 1920. — 49 s.

2. Eberhardt, P. Przemiany narodowosciowe na Bialorusi / P. Eberhardt. — Warszawa : Editions Spotkania, 1994. — 181 s.

3. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. — T. VIII: Województwo poleskie / opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. Główny Urząd Statystyczny Rzeczypospolitej Polskiej. — Warszawa: Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1924. — XI, 96 s.

4. Ладысеў, У. Беларускае пытанне ў Другой Рэчы Паспалітай 1919—1939 гг. / У. Ладысеў // Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта: У 7 т. Т. 2. Гісторыя. Філалогія. Журналістыка / Адк. рэд. А. А. Яноўскі. — Мінск : БДУ, 2001. — С. 101—108.

5. Трафімчык, А. Адкуль пайшла назва “Круговічы” / А. Трафімчык // Ганцавіцкі час. — 2013. — 5 вер. — С. 8.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 694. Воп. 4. Спр. 778.

7. Мірановіч, Я. Нацыянальнае пытанне ў палітыцы Праваслаўнай царквы Заходняй Беларусі (1921—1939) / Я. Мірановіч // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа. — Гродна : ГрДУ, 2008. — С. 318—322.

8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей — ДАБр). — Ф. 2002. Воп. 2. Спр. 907.

9. ДАБр. — Ф. 595. Воп. 4. Спр. 1310.

10. Герасіменя, В. Частка трэцяя: Лактышы, Нач, Гута, Ясянец / В. Герасіменя // Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал. — URL: http://www.gants-region.info/publ/vitalij_gerasimenja/khryscijanskija_svjatyni_gancawshchyny/chastka_trehcjaja_laktyshy_nach_guta_jasenec/13-1-0-105 (дата звароту: 19.08.2023).

11. Kościół, zbudowany przez żołnierzy KOP w Ludwikowie // Wiarus. — 1939. — Nr. 8, 19 lut. — S. 268.

12. ДАБр. — Ф. 2014. Воп. 1. Спр. 8.

*Паступіў у рэдакцыю 13.10.2025.*

*У матэрыяле выкарыстаны фота з архіваў Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея, Круговіцкай сярэдняй школы Ганцавіцкага раёна, Архіва новых актаў (Варшава), адкрытых крыніц.*